**Часопіс “Беларуская мова і літаратура” №2 (232), 2021**

## Комплекснае заданне для паўтарэння і сістэматызацыі вывучанага па тэме “Прыметнік”

Частка А

А1. Адзначце спалучэнні з якаснымі прыметнікамі:
1) пасудная паліца;
2) цяжкая прамысловасць;
3) халасты чалавек;
4) вопытны менеджар;
5) ліпеньскі дзень.

А2.Адзначце спалучэнні з адноснымі прыметнікамі:
1) лісінае футра;
2) матчына ласка;
3) бабуліна спадніца;
4) буслава гняздо;
5) лёгкая атлетыка.

А3. Адзначце спалучэнні з прыналежнымі прыметнікамі:
1) Мележаўскія чытанні;
2) Коласавы творы;
3) Верчына хустка;
4) лісіная нара;
5) школьны будынак.

А4. Адзначце адносныя прыметнікі, якія перайшлі ў разрад якасных:
1) залаты характар;
2) свінцовыя кулі;
3) стальныя нервы;
4) жалезныя дзверы;
5) позняя зіма.

А5. Адзначце прыметнікі ад якіх можна ўтварыць ступені параўнання:
1) зеленаваты;
2) белагрывы;
3) зялёны;
4) прыгожы;
5) дрэнны.

А6. Адзначце правільна запісаныя формы параўнання якасных прыметнікаў:
1) самы найсмачнейшы;
2) самы добры;
3) больш вузейшы;
4) найбольшы;
5) менш працаздольны.

A7. Адзначце прыклады з няправільна запісанай формай якасных прыметнікаў:
1) самы найлепшы;
2) больш вузкі;
3) найбольш прыгажэйшы;
4) самы цудоўны;
5) менш прасцейшы.

A8. Адзначце правільныя сцвярджэнні:
1) прыналежныя прыметнікі ва ўсіх склонах маюць толькі поўную форму;
2) прыстаўкі і суфіксы, пры дапамозе якіх утвараюцца ступені параўнання прыметнікаў, з'яўляюцца словаўтваральнымі;
3) ад якасных прыметнікаў, што абазначаюць нязменную якасць або прымету, нельга ўтварыць ступеней параўнання;
4) у беларускай мове якасныя прыметнікі могуць пераходзіць у разрад адносных;
5) у спалучэнні цяжкая прамысловасць слова **<u>цяжкая</u>** –якасны прыметнік.

A9. Адзначце выразы з правільна запісанай формай параўнання якасных прыметнікаў:
1) найпрасцей;
2) горшы;
3) больш танны;
4) горш за ўсіх;
5) найдалікатнейшы.

A10. Адзначце словазлучэнні, дзе пры напісанні дапушчаны памылкі:
1) ля суседнега двара;
2) са шчыраю ўсмешкаю;
3) у вялікім пакоі;
4) у дарагом касцюме;
5) на бязмежным небе.

A11. Адзначце характарыстыкі прыметніка у сказе **Неба завалаклі свінцовыя хмары**.
1) прыналежны прыметнік;
2) адносны прыметнік;
3) якасны прыметнік;
4) адносны прыметнік, ужыты ў значэнні якаснага;
5) у форме множнага ліку меснага склону мае канчатак ***–ых***

A12. Адзначце спалучэнні, пры напісанні якіх дапушчаны памылкі:
1) Надзіныя чаравікі;
2) Міхасёў шлем;
3) Міколкавы сябры;
4) старэйшы брата;
5) Валінага паліто.

A13. Адзначце няправільныя сцвярджэнні:

1) у сказе прыметнік можа быць толькі азначэннем;
2) прыметнікі могуць пераходзіць у назоўнікі;
3) у словазлучэнні часам прыметнікі могуць выступаць у ролі галоўнага слова;
4) прыметнікі часта ўтвараюцца ад назоўнікаў;
5) прыметнік можа выступаць у ролі ўсіх дадзеных членаў сказа.

А14. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнік выступае ў ролі галоўнага слова:
1) летні дзень;
2) мокры ад дажджу;
3) двайны падлік;
4) горшы за ўсіх;
5) добрыя вучні.

А15. Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць ролю азначэнняў:
1) Маладая сыпанула жменю цукерак.
2) На вуліцы мы сустрэлі рабочых.
3) Ліпень пякучы, але шчодры на ягады і грыбы.
4) Маладая настаўніца толькі што закончыла вну.
5) Бацька Анатолеў працаваў выкладчыкам роднай мовы.

А16. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць <u>адну</u> літару **н**:
1) ю…ы;
2) страшэ…ы;
3) куры…ы;
4) сцюдзё…ы;
5) лімо…ы.

А17. Адзначце прыметнікі, дзе трэба ўставіць <u>дзве</u> літары **н**:
1) стара…ы;
2) штодзё…ы;
3) духмя…ы;
4) вогне…ы;
5) палымя…ы.

А18. Адзначце спалучэнні слоў, пры напісанні якіх дапушчаны памылкі:
1) палесскія краявіды;
2) таварыскія адносіны;
3) жнівеньскі дзень;
4) грамацкія абавязкі;
5) гарадскія пейзажы.

А19. Адзначце радкі, у якіх напісанне ўсіх слоў адпавядае беларускай арфаграфіі:
1) чэрвеньскае ранне, паляшуцкія звычаі, кіргіскі юнак;
2) Нясвіжскі раён, глыбоцкія пейзажы, латышскія стралкі;
3) арэсскія краявіды, батальённы камандзір, юны партызан;
4) рыбацкія снасці, фінляндскія вакзалы, Любаньскі раён;

5) вуліца Уманская, казахскія традыцыі, казацкая шабля.

A20. Адзначце радкі, у якіх парушаны нормы напісання некаторых слоў:
1) завоцкі, наглядчыцкі, снежаньскі;
2) камсамольскі, вераб'іны, сураскі;
3) гасціны (народ), турэцкі, славакскі;
4) калмыцкі, лебядзіны, узбекскі;
5) чэшскі, французскі, саламяны.

A21. Адзначце правільна напісаныя спалучэнні:
1) Гродненская вобласць;
2) Добрушскі раён;
3) асіповіцкі поезд;
4) маладзечненская электрычка;
5) мінскі напрамак.

A22. Адзначце прыклады, дзе складаныя прыметнікі пішуцца разам:
1) паўднёва (ўсходні) вецер;
2) лаціна (амерыканскія) краіны;
3) васьмідзесяцішасці (кватэрны) дом;
4) грунтоўна (правільнае) выступленне;
5) чырвона (белая) паверхня.

A23. Адзначце прыклады, дзе складаныя прыметнікі пішуцца праз злучок.
1) вада (лазны) касцюм;
2) Заходне (Сібірская) нізіна;
3) царкоўна (прыходская) школа;
4) паўночна (ўсходні) вецер;
5) паўднёва (афрыканскія) землі.

A24. Адзначце прыклады, дзе словы, што ў дужках, трэба пісаць асобна:
1) шчыра (паважаны) чалавек;
2) па-сяброўску (шчырае) слова;
3) па-старэчы (мудры) твар;
4) народна (гаспадарчая) задача;
5) народна (патрыятычны) рух.

A25. Адзначце радкі, у якіх напісанне складаных прыметнікаў адпавядае нормам беларускай арфаграфіі:
1) спартыўна-трэніровачны, двухярусны, трохпакаёвы;
2) Паўночна-Курыльскія (астравы),прынцыпова новы, выпукла-ўвагнуты;
3) класна-ўрочны, заходнесібірскія (рэкі), шэра-блакітны;
4) старадарожскі, станоўча-падрыхтаваны, малакаплектны;
5) трох'ярусны, усходнеславянскія (землі), вечназялёны.

A26. Адзначце прыметнікі, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) прыгарадны;
2) пазашкольны;
3) прыбярэжны;
4) дарожны;

5) заводскі.

A27. Адзначце прыметнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:

1) шматпавярховы;
2) прыморскі;
3) дзевяцікласнік;
4) дачарнобыльскі;
5) звышімклівы.

A28. Адзначце выпадкі, дзе не(ня) з прыметнікамі пішацца асобна:

1) далёка (не) добры чалавек;
2) (не) вялікая, але вельмі патрэбная кніга;
3) (не) мелкі, а глыбокі вадаём;
4) (не) цікавы чалавек;
5) (не) лепшы за брата.

A29. Адзначце выпадкі злітнага напісання не(ня) з прыметнікамі:

1) (не) старэйшы за сястру;
2) зусім (не) цікавае выступленне;
3) (не) вопытны, але разумны чалавек;
4) (не) стары, а малады настаўнік;
5) (не) цікавыя заняткі.

A30. Адзначце выразы, у якіх дзеепрыметнікі перайшлі ў прыметнікі:

1) адпеты лайдак;
2) зацыраваная шкарпэтка;
3) пафарбаваная падлога;
4) зачараванае кола;
5) вылінялая хустка.

## Частка В

B1.Знайдзіце і выпішыце прыметнік складанай формы найвышэйшай ступені параўнання:

1) свяжэйшы;
2) найярчэй;
3) больш глыбока;
4) лепшы;
5) самы востры.

B2. Утварыце і запішыце простую форму вышэйшай ступені параўнання прыметніка **добры**.

B3. Запішыце выраз па-беларуску **мать мудрее детей**.

B4. Запішыце, якім членам сказа з’яўляюцца прыметнікі ў сказе **Лета было сонечным, ласкавым**.

B5. Выпішыце складаны прыметнік, які пішацца ў два словы.

1) параўнальна (невялікі);
2) многа (векавы);
3) цьмяна (попельны);
4) паўднёва (карэйскі);

5) сіні (сіні).

В6. Запішыце беларускі адпаведнік да рускага словазлучэння **кожаные сапоги**.

В7. Знайдзіце словазлучэнне, у якім пры напісанні прыметніка дапушчана арфаграфічная памылка. Запішыце гэты прыметнік правільна ў пачатковай форме.

1) Белавеская пушча;
2) Брандэнбургскія вароты;
3) людская дабрыня;
4) кубанскія стэпы;
5) Паўднёва-Кітайскае мора.

В8. Выпішыце спалучэнне з якасным прыметнікам:

1) снежная баба;
2) снежная замець;
3) снежны дзень;
4) снежныя заносы;
5) снежныя гурбы.

В9. Знайдзіце прыметнік, пры напісанні якога дапушчана арфаграфічная памылка. Запішыце гэты прыметнік правільна.

1) восенскі;
2) смаргонскі;
3) азіяцкі;
4) цянь-шанскі;
5) слаўгарадскі.

В10. Выпішыце пяты "лішні" прыметнік (паводле напісання):

1) (леў) талстоўскі;
2) (гісторыка) філалагічны;
3) (спартыўна) масавы;
4) (прама) прапарцыянальны;
5) (залаціста) жоўты.

## Адказы

### Частка А

A1—3, 4
A2—1, 5
A3—2, 3, 4
A4—1, 3
A5—3, 4, 5
A6—2, 4, 5
A7—1, 3, 5
A8—3, 4

A16—1, 3, 4
A17—1, 2, 4
A18—1, 4
A19—2, 5
A20—1, 2, 3
A21—2, 3, 5
A22—2, 3
A23—2, 4

A9—2, 3, 5
A10—1, 4
A11—4, 5
A12—1, 4
A13—1, 5
A14—2, 4
A15—4, 5
A24—2, 3
A25—2, 3, 5
A26—1, 4, 5
A27—2, 4
A28—1, 3, 5
A29—3, 5
A30—1, 4

Частка В

B1—самывостры
B2—лепшы
B3—мацімудрэйшаязадзяцей
B4—выказнікам
B5—параўнальна невялікі
B6—скураныя боты
B7—белавежскі
B8—снежныдзень
B9—восеньскі
B10—прама прапарцыянальны